**Падвядзём вынікі.** Беларусь характарызуецца выгадным фізіка-геаграфічным і эканоміка-геаграфічным становішчам. Беларусь — сярэдняя па памерах краіна Еўропы плошчай 207,6 тыс. км$^2$, размешчаная ў цэнтры Еўропы. Працягласць дзяржаўнай мяжы Беларусі з Расіяй, Украінай, Польшчай, Літвой і Латвіяй складае 3617 км.

***Праверце сябе.*** 1. У чым адрозненне фізіка-геаграфічнага становішча тэрыторыі ад эканоміка-геаграфічнага? 2. Дзе знаходзяцца геаграфічны цэнтр Беларусі і геаграфічны цэнтр Еўропы? 3 З якімі краінамі мяжуе Беларусь? Пералічыце іх па меры змяншэння працягласці меж.

***Праблемныя пытанні.*** 1. Вызначце асноўныя станоўчыя і адмоўныя асаблівасці фізіка-геаграфічнага і эканоміка-геаграфічнага становішча Беларусі. 2. Якая вобласць Беларусі мяжуе з найбольшай колькасцю краін? 3. Якія вобласці Расіі і Украіны мяжуюць з Беларуссю?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Разлічыце, у колькі разоў большая або меншая тэрыторыя Беларусі ў параўнанні з тэрыторыямі краін-суседак.

## § 2. Фарміраванне тэрыторыі, адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел

***Успомніце.*** *У склад якіх дзяржаў уваходзіла тэрыторыя Беларусі на працягу гістарычнага развіцця? Якія адзінкі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу прымяняюцца ў краінах свету? Для чаго праводзіцца адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел?*

**1. Фарміраванне дзяржаўнай тэрыторыі.** Межы краін свету ўвесь час змяняюцца. Для Беларусі, якая размешчана ў цэнтры Еўропы, характэрна складаная гісторыя фарміравання тэрыторыі. Гэта абумоўлена пастаянным сутыкненнем палітычных інтарэсаў розных краін.

З урокаў гісторыі Беларусі вы ведаеце, што ў X ст. на землях сучаснай Беларусі ўзніклі першыя формы дзяржаўнасці — Полацкае і Тураўскае княствы, якія дасягнулі росквіту ў XI ст. У XIII–XVIII стст. тэрыторыя Беларусі ўваходзіла ў склад Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ). Тэрытарыяльную аснову ВКЛ складалі сучасныя беларускія землі, а дзяржаўнай мовай была старабеларуская. З другой паловы XVI ст. да канца XVIII ст. землі ВКЛ уваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай. Напрыканцы XVIII ст. пасля падзелаў Рэчы Паспалітай беларускія землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі і заставаліся ў ёй да 1917 г.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і заканчэння Першай сусветнай вайны 1 студзеня 1919 г. была абвешчана Сацыялістычная

Савецкая Рэспубліка Беларусі (ССРБ), пазней — Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР). У 1922 г. БССР нараўне з іншымі савецкімі рэспублікамі падпісала Дэкларацыю і Дагавор аб утварэнні СССР.

У 1920-я гг. неаднаразова адбывалася змена меж Беларусі. Спачатку (1919 г.) да Савецкай Расіі адышлі Магілёўская, Віцебская і Смаленская губерні. Затым па ўмовах Рыжскага міру (1921 г.) Заходняя Беларусь плошчай 108 тыс. км$^2$ з насельніцтвам каля 4,6 млн чалавек увайшла ў склад Польшчы. У складзе БССР засталося толькі шэсць паветаў Мінскай губерні. Плошча рэспублікі скарацілася да 52 тыс. км$^2$. Пасля вяртання 17 паветаў Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў у 1924, 1926 гг. плошча БССР павялічылася да 125 тыс. км$^2$, а насельніцтва — да 5 млн чалавек (мал. 4).

Наступнае змяненне меж Беларусі было ў 1939 г. Адбылося ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР, і плошча краіны склала 234 тыс. км$^2$.

З 2021 г. 17 верасня наша краіна святкуе Дзень народнага адзінства. Гэтая дата з'яўляецца сімвалам адноўленай гістарычнай справядлівасці ў адносінах да беларускага народа, які быў раздзелены супраць яго волі ў 1921 г.

У 1945 г. 18 раёнаў Беластоцкай і Брэсцкай абласцей былі перададзены Польшчы (мал. 5). Апошняе ўдакладненне меж паміж Смаленскай і Магілёўскай абласцямі адбылося ў 1964 г., пасля чаго дзяржаўныя межы Беларусі не змяняліся.




Мал. 4. Тэрыторыя Беларусі ў 1920-я гг.

Мал. 5. Тэрыторыя Беларусі ў 1930–1940-я гг.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі, а ў верасні 1991 г. зацвердзіў новую назву — Рэспубліка Беларусь. 8 снежня 1991 г. былі падпісаны дакументы аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). У 1999 г. была створана Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі. У 2010 г. пачаў дзейнічаць Мытны саюз Беларусі, Расіі і Казахстана, а ў 2015 г. — Еўразійскі эканамічны саюз (ЕАЭС), да якога далучыліся Арменія і Кыргызстан.

**2. Фарміраванне адміністрацыйнага падзелу Беларусі.** Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел (АТП) прадугледжвае падзел тэрыторыі дзяржавы на рэгіёны рознага рангу для ўдасканалення кіравання іх сацыяльна-эканамічным развіццём. Кожная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка мае мясцовыя органы ўлады, якія падпарадкоўваюцца органам улады буйнейшага рангу.

Успомніце, які АТП быў на тэрыторыі Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды.

У 1924 г. у СССР уведзены новы адміністрацыйны падзел. Тэрыторыя была падзелена на акругі і раёны, а тыя — на сельсаветы. У 1938 г. замест акругі ўведзена новая адзінка — вобласць. У 1940–1960-я гг. у Беларусі вылучалася да 10 абласцей і 195 раёнаў. Пасля змен АТП у 1965–1966 гг. у БССР засталося 6 абласцей і 117 раёнаў, да якіх у 1989 г. дадаўся Дрыбінскі раён у Магілёўскай вобласці.

**3. Сучасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел.** Сучасны АТП Беларусі ўключае наступныя адзінкі: вобласць — раён — сельсавет (гарсавет). У Беларусі вылучаецца шэсць абласцей: Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Магілёўская і Мінская. Плошчы абласцей апошнім часам не змяняюцца і складаюць ад 25,1 тыс. км$^2$ (Гродзенская) да 40,4 тыс. км$^2$ (Гомельская) (мал. 6).




Мал. 6. Плошча (тыс. км$^2$) і насельніцтва (тыс. чал.) абласцей Беларусі на 01.01.2024

Значна больш вобласці адрозніваюцца па колькасці жыхароў. Па стане на 01.01.2024 у Магілёўскай вобласці пражывае каля 980 тыс. чалавек, а ў Мінскай (разам з г. Мінскам) — больш за 3450 тыс. чалавек. У межах абласцей вылучаецца 118 раёнаў. Тэрыторыя адміністрацыйных раёнаў падзяляецца на сельсаветы (1127, і іх колькасць змяншаецца). Як асобныя адміністрацыйныя адзінкі выступаюць некаторыя гарады і пасёлкі гарадскога тыпу, якія маюць абласное або раённае падпарадкаванне (мал. 7). Сярод пасёлкаў гарадскога тыпу вылучаюцца гарадскія, курортныя і працоўныя пасёлкі. Буйныя гарады падзяляюцца на гарадскія раёны. Асаблівы статус (горад рэспубліканскага падпарадкавання) мае сталіца Беларусі — г. Мінск. Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі вылучаецца 1475 адміністрацыйных адзінак (па стане на 01.01.2024).

Сучасны адміністрацыйны падзел Беларусі склаўся ў часы СССР. Ён даволі груваткі і прыводзіць да дубліравання асобных функцый адміністрацыйнымі адзінкамі. Пачынаючы з 1995 г. у краіне аб’ядноўваюцца адміністрацыйныя адзінкі з адным цэнтрам, які ажыццяўляе кіраванне горадам і прылеглым раёнам (напрыклад, Орша і Аршанскі раён). Распрацоўваюцца варыянты аптымізацыі АТП, якія прадугледжваюць скасаванне абласцей і ўзбуйненне раёнаў са скарачэннем іх колькасці.




Мал. 7. Сучасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі на 01.01.2024



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Чатыры абласныя цэнтры (Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна) знаходзяцца на ўскраінах абласцей. Акрамя абласных цэнтраў, існуе больш за 10 буйных гарадоў, якія выконваюць разнастайныя функцыі. Прапануйце варыянт змены АТП з вылучэннем 20–30 галоўных адміністрацыйных адзінак, якія заменяць цэнтры абласцей і раёнаў.

**Падвядзём вынікі.** Фарміраванне тэрыторыі Беларусі адбывалася да 1964 г. З 1989 г. у Беларусі вылучаецца 1475 адміністрацыйных адзінак, у т. л. 6 абласцей і 118 раёнаў.

***Праверце сябе.*** 1. Якія адзінкі АТП існавалі на Беларусі ў розныя часы? 2. Якія апошнія змены АТП Беларусі праводзіліся на ўзроўні абласцей і раёнаў?

***Праблемныя пытанні.*** Якія галоўныя адміністрацыйныя адзінкі, на ваш погляд, мэтазгодна пакінуць пры ўдакладненні адміністрацыйнага падзелу?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Пры дапамозе карт атласа вызначце раённыя цэнтры, больш аддаленыя ад абласных цэнтраў, чым ад Мінска.

## § 3. Геаграфічныя даследаванні

***Успомніце.*** *Які ўнёсак у развіццё геаграфічных даследаванняў свету зрабілі ўраджэнцы Беларусі? Якія навукі адносяцца да геаграфічных? Якія сучасныя геаграфічныя навукі развіваюцца найбольш хуткімі тэмпамі?*

**1. Асноўныя этапы геаграфічных даследаванняў Беларусі.** Даследаванні Беларусі ў розныя часы мелі свае асаблівасці, адрозніваліся методыкай і арганізацыяй, абсталяваннем, ахопам тэрыторыі. Умоўна геаграфічныя даследаванні тэрыторыі сучаснай Беларусі можна падзяліць на тры этапы: дасавецкі (да кастрычніка 1917 г.), даваенны (да 1941 г.), сучасны (пасля 1945 г.).

**2. Даследаванні тэрыторыі Беларусі на дасавецкім этапе.** На дасавецкім этапе даследаванні мелі эпізадычны характар і звычайна ахоплівалі асобныя рэгіёны Беларусі.

Першыя звесткі пра геаграфічныя аб’екты Беларусі змяшчаюцца на антычных і сярэдневяковых картах. У канцы XVI ст. па ініцыятыве нясвіжскага князя Мікалая Крыштофа Радзівіла была падрыхтавана карта ВКЛ з каардынатнай сеткай, населенымі пунктамі, рэкамі і азёрамі. Радзівілаўская карта стала здабыткам еўрапейскай картаграфіі. Дзякуючы ёй за этнічнай тэрыторыяй беларусаў замацоўваецца назва